УДК 94(476)

# АКУПАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У АДНОСІНАХ ДА ЯЎРЭЙСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ІВАНАЎСКАГА РАЁНА

**І. У. Пажывілка**
*студэнт гістарычнага факультэта*
*Навуковы кіраўнік* **Саўчук Т. П.**, *кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
*Беларусь, г. Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна*

У дадзеным артыкуле даследуецца праблема палітыкі нямецка-фашысцкіх захопнікаў адносна да прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці ў Іванаўскім раёне. На прыкладзе населенных пунктаў Іванава і Моталь даецца характарыстыка дзейнасці акупантаў у дачыненні да яўрэяў.

*Ключавыя словы*: Вялікая Айчынная вайна; генацыд; Халакост; яўрэі; Іванава; Іванаўскае гета; Моталь; расстрэл.

Жорсткая і трагічная Вялікая Айчынная вайна пакінула вялізны незгладжальны след у гісторыі беларускага народа. Паводле звестак Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, вайна бязлітасна забрала жыццё ў кожнага трэцяга жыхара БССР. Цэлыя народы падвяргаліся фізічнаму знішчэнню і рэпрэсіям. Для абазначэння дадзеных злачынстваў выкарыстоўваецца тэрмін “генацыд” [1].

Становішча яўрэяў пачало пагаршацца з моманту прыхода Гітлера да ўлады ў 1933 г. Паслядоўна ўзнікалі заканадаўчыя акты, якія абмяжоўвалі правы яўрэяў у розных сферах жыцця: эканамічнай, палітычнай і культурнай. Да пачатку Другой сусветнай вайны Германію і Аўстрыю пакінулі больш за 300 тысяч яўрэяў. З 1939 г. пачалася прымусовая адпраўка яўрэяў, а 27 верасня выйшла распараджэнне аб іх перасяленні ў гета. У далейшым дзеянні нацыстаў у адносінах да яўрэяў перараслі ад палітыкі пераследу да палітыкі “канчатковага вырашэння пытання”, гэта значыць іх масавага знішчэння [2]. У сучаснай навуцы да абазначэння палітыкі пераследу і вынішчэння асоб яўрэйскай нацыянальнасці ў еўрапейскіх краінах выкарыстоўваецца тэрмін “Халакост” [3].

Згодна з матэрыяламі перапісу БССР, да пачатку Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі пражывала прыкладна каля 940 тысяч яўрэяў [4]. З асобай жорсткасцю карныя органы фашысцкіх захопнікаў арганізоўвалі вынішчэнне яўрэяў на тэрыторыі нашай краіны. На прыкладзе даваеннага гарадскога пасёлка Іванава (сучасны раённы цэнтр Брэсцкай вобласці) можна ўбачыць, што з 6517 жыхароў Іванава яўрэі складалі прыкладна палову. Гэта былі ўрачы і настаўнікі, крамнікі і кавалі, краўцы і шаўцы [5, с. 168].

Фашысцкая армія заняла раённы цэнтр 27 чэрвеня 1941 г. [5, с. 157]. З першых дзён акупацыі ў раёне быў арганізаваны генацыд супраць асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Праз некаторы час, летам 1941 г., частка мужчын-яўрэяў была расстраляна ва ўрочышчы Баравіца, а астатніх, у тым ліку жанчын, дзяцей, старых, сагналі ў гета, якое было размешчана ў цэнтры Іванава. Знакам выдзялення вязняў гета ад жыхароў горада служылі laткі жоўтага колеру. Разумеючы

бязвыходнасць свайго стану, людзі не мелі надзею на выратаванне, таму чакалі свайго лёсу ў пачуцці страху і набліжэння смерці [5, с. 168].

Па іншаму нямецкія карнікі дзейнічалі ў мястэчку Моталь, якое было занята 26 ліпеня 1941 г. Згодна з актам ад 16 кастрычніка 1944 г. раённай камісіі па расследаванні злачынстваў акупантаў у г. п. Моталь, расстрэл мірных жыхароў пасёлка пачаўся 3 жніўня 1941 г. Гітлераўцы акружылі мястэчка, а затым сагналі на базарную плошчу ўсіх яўрэяў. Мужчын аддзялілі ад старых, жанчын і дзяцей, затым адправілі асобнай калонай у кірунку вёскі Асаўніца Моладаўскага сельскага савета. Далей падчас вывядзення мужчын за вёску Асаўніца на ўсход ад вёскі на 1500 м. немцы пачалі іх расстрэльваць. Да канца дня там было растраляна каля 1400 чалавек [5, с. 168]. Жыхарка Моталя А. В. Надольская бачыла, як па вёсцы гналі калону яўрэяў-мужчын. Яны спявалі свае песні, плакалі і крычалі, ведаючы, што іх чакае за пасёлкам. Усе мужчыны былі растраляныя і закапаныя ў чатырох магілах, на месцы адной з іх стаіць памятны знак [6]. Жанчын і дзяцей, накіраванных на вёску Калілы, немцы расстралялі на поўдзень ад Моталя, па дарозе Моталь – Калілы ва ўрочышчы Гаі, што на 500 метраў на поўдзень ад Моталя. За кароткі час былі растраляны 3000 жыхароў Моталя [5, с. 168].

Такі лёс напаткаў і вязняў Іванаўскага гета. Раніцай 26 верасня 1942 г. калоны людзей вялі да ўскраіны рудскага лесу. Відавочцы тых жудасных падзей Курыловіч Марыя Мікалаеўна і Куліч Раіса Мікалаеўна ўспаміналі: “У той дзень горад, здавалася, замёр, затаіўшыся ў страшнай прыгнечанай цішы. Яны ішлі спакойна насустрач наканаванаму ім лёсу. Нейкая нечалавечая пакорнасць была ў іх вачах, у іх постацях. Моцна прыціскалі да сябе дзяцей матулі. Закаханыя крочылі, цесна абняўшыся. Калі зайшлі ў лес, некалькі дзесяткаў чалавек кінуліся наўцёкі. Услед ім грымнулі стрэлы. Выратавацца ўдалося нямногім. А астатнім загадалі распранацца. У кучу складвалі адзенне, абутак, каштоўнасці, якія яшчэ засталіся. Затым пачалі па чарзе падводзіць да ям, выкапаных раней, і стралялі... А ноччу... Ноччу не толькі горад, але ўсе навакольныя вёскі прачнуліся ад стрэлаў, стогнаў, енкаў. Гарэла падпаленае гета” [5, с. 168–169].

Частка людзей спрабавала схавацца ў сховішчах, якія плённа рыхтавала дагэтуль. Але дым і агонь вывеў іх з гета. Некаторыя бацькі перакідвалі сваіх дзяцей і немаўлят праз калючы дрот, але і тут фашысты не ведалі літасці – кідалі іх назад, жывымі ў вагонь. На ранак на месцы гета засталіся толькі догараючыя галавешкі.

Адной з нямногіх ахвяр Іванаўскага гета, каму ўдалося ўратавацца, была Соня Кірз. Яна змагла ўратавацца не толькі ад агню, але і варожай кулі пад час расстрэла ў двары сінагогі. Яна далучылася да партызанскага руху, стала членам ВЛКСМ, знаходзілася на ўліку ў пярвічнай камсамольскай арганізацыі атрада імя С. Г. Лазо брыгады імя Молатава [5, с. 171–172].

У 2021 г. на месцы гета быў устаноўлены помнік у памяць аб яго вязнях, на якім змяшчаецца надпіс на чатырох мовах. Знак устаноўлены пры фінансавым садзейнічанні Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын [7].

Вялікая Айчынная вайна пакінула вялізную рану ў памяці беларускага народа. Практычна няма такой сям’і, якая не перажыла боль ад страты роднага чалавека пад час вайны. Нямецка-фашысцкія захопнікі з асаблівай жорсткасцю і цынізмам абыходзіліся з яўрэйскім насельніцтвам Іванаўскага раёна. Матэрыяльныя страты, нанесеныя раёну, былі кампенсаваны, а гібель людзей не папоўніць ніколі.

**Спіс крыніц і літаратуры:**

1. Историческая справка о геноциде белорусского народа в годы Великой Отечественной войны. – URL: https://prokuratura.gov.by/%D0%98%D1%81%D1%82%D0%BE%D1%80%D0%B8%D1%87%D0%B5%D1%81%D0%BA%D0%B0%D1%8F%20%D1%81%D0%BF%D1%80%D0%B0%D0%B2%D0%BA%D0%B0.pdf (дата звароту: 05.11.2024).
2. Плесовских, А. Е. и др. Политика нацистской Германии по отношению к евреям и её оценка на Нюрнбергском процессе / А. Е. Плесовских, Ю. Г. Чернышев // Труды молодых учёных Алтайского государственного университета. – 2015. – № 16. – URL: https://elibrary.ru/item.asp?id=25519105 (дата обращения: 04.11.2024).
3. Розенблат, Е. С. Основные вопросы терминологии темы Холокоста [Тэкст] / Е. С. Розенблат // Материалы Одиннадцатой ежегодной международной междисциплинарной конференции по иудаике (Москва, 3–5 февраля 2004 г.). – М. : Издательство Пробел-2000, 2004. – Ч. 1. – 480 с. – С. 341–355.
4. Новикова, А. Г. Холокост в Беларуси во время Великой Отечественной войны / А. Г. Новикова // Научная конференция учащихся колледжа: материалы 58-й научной конференции аспирантов, магистрантов и студентов БГУИР (Минск, 18–22 апреля 2022 г.). – Минск : Белорусский государственный университет информатики и радиофизики, 2022. – С. 313–317.
5. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага р-на [Тэкст]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 526 с.
6. Марзан, О. С. Мотоль: история населённого пункта / О. С. Марзан, А. Ю. Баюров, М. А. Корсак // Молодой учёный. – 2018. – № 14 (200). – URL: https://moluch.ru/archive/200/49227/ (дата обращения: 05.11.2024).
7. Памятный знак в память об узниках еврейского гетто в городе Иваново – URL: https://izvezda.by/ru/monuments-ru/getElement/6792/ (дата обращения: 05.11.2024).